Газета для вас

ІВАЦЭВІЧЫ–БАРАНАВІЧЫ–БЯРОЗА–ПРУЖАНЫ

№ 20(231) 19 — 25 мая 2000 г. | ГРАМАДСКАЕ НЕЗАЛЕЖНАЕ ВЫДАННЕ, ВЫХОДЗІЦЬ СА СТУДЗЕНЯ 1997 г. | Цана — 50 руб.

У Прэзідэнта з спортам
дружба,
Чуў не раз яго размовы.
Едзе ён да нас "па службе" —
Мо, вырасце палац лядовы?



20 МАЯ — ДЗЕНЬ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ І СПОРТУ

ЧТОБЫ БЫТЬ КРАСИВЫМ, МОЛОДЫМ И СИЛЬНЫМ

Ивацевичи, конечно, не Минск, не Брест, и ледовые дворцы здесь не строят и, надо понимать, не скоро начнут строиться. В сером однообразии провинциальной жизни молодежь, что тянется к занятиям спортом, выбирает то, что доступнее: футбол, шахматы, бег трусцой, бодибилдинг.

Некоторые из этих энтузиастов не перестают удивлять. Наш конкурс "Друзья гармонии и штанги" тому лучшее подтверждение.

Знакомьтесь: Иван, работает на ОАО "Ивацевичдрев", время досуга и спорт для него понятия неразделимые.

— Иван, а почему собственно бодибилдинг?

— Душой чувствую — моё (улыбается). Активно со штангой работал в армии, отслужив, как видишь, не забросил.

— Что для тебя значит спорт?

— Спорт — та область, где можно проверить или проявить себя, где можно увидеть конкретные результаты твоих трудов. И заниматься им никогда не поздно. Занимаются, как я заметил, люди самых разных возрастов.

— И какие особенности жизни провинциального "культа"?

— Нас здесь немного, и друг друга мы отлично знаем. Соперничать негде, ведь даже в Минске, в центре, подобные мероприятия, скажу так, еле тлеют. Хоть за границей бодибилдинг — область солидного бизнеса.

— Кумиры бодибилдинга на Западе сегодня как небожители. Достигнут ли наши "культы" когда-нибудь такого уровня?

— Достигнуть такого уровня — не проблема. Разве что А. Шварценеггер — уникум в этом роде. Уровень остальных — вполне достижим.

— Что для этого надо?

— Время да финансы. Западные культы могут себе позволить по три часа в день "качаться", много есть да спать, наращивая мышечную массу.

Наши же ребята, даже занимаясь любительски, то есть, работая на основной работе, воюя на грядках и дачах, имеют хороший уровень. Но все это поставлено не на ту основу, как за рубежом.

— И традиционно несколько слов о себе.

— По гороскопу — Рак. В свободное время занимаюсь атлетической гимнастикой. Кумир — Арнольд Шварценеггер. Музыку слушаю самую разную, чаще всего — "попсу".

Нравятся симпатичные, с длинными, как у меня (смеётся), ресницами девушки. Не нравятся легкомысленные, поверхностные, а нравятся умные и толковые.

Беседовал Александр ГОРБАЧ.
г. Ивацевичи.



МЫ ЎСЁ ЧАКАЕМ ПРЭЗІДЭНТА

БЯРОЗА. Горад Белаазёрск у чарговы раз чакае Аляксандра Лукашэнку. Чакаецца, што наведаўшы першую ў Беларусі Бярозаўскую ДРЭС, ён будзе прымаць рашэнне: ці даваць грошы ў памеры каля 170 млн. $ на рэканструкцыю станцыі.

Уся абласная, раённая і гарадская вертыкаль, уключаючы кіраўнікоў усіх прадпрыемстваў горада, распрацавала план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы горада да сустрэчы. На станцыі фарбуюць галоўны корпус, абсталяванне, усё тое, што можа трапіць на вочы высокай асобе. Нават памылі вокны, што ніколі не адкрываліся і не мыліся. У горадзе шчырые санстанцыя: некалькі людзей ужо атрымалі вялікія штрафы (да 20 "мінімалак") за нязначныя недахопы. Праца па падрыхтоўцы горада вядзецца ў дзве змены і па выхадных днях таксама. Нават знайшліся грошы, якіх не было некалькі гадоў на ўкладку асфальту па вуліцах Леніна і Энергетыкаў, на ямачны рамонт вуліцаў. Вельмі "дасталося" краме № 9, у якую зойдзе Лукашэнка. Перад ёю зламалі асфальт, памянялі яшчэ добрыя бардзюры. Вельмі задаволеныя хворыя ў бальніцы: ніколі іх так не кармілі, як цяпер. "Ах, каб ён ездзіў часцей," — кажуць яны. Знайшліся грошы на рамонт фасаду бальніцы, новыя цюлі. А хворых папярэджваюць, каб не скардзіліся на адсутнасць лекаў, якія ім прыходзіцца купляць самім. Ва ўсім горадзе мятуць, беляць, фарбуюць, садзяць кветкі, дзе іх ніколі не было і не будзе. Каб толькі дагадзіць першай асобе і захаваць свае пасады. Увесь горад "стаіць на вушах". Гараджане задаволеныя: "Хоць горад прыбярэцца і папрыгажэе".

Сяржук РУСЕЦКІ.

"ІВАЦЭВІЦКІ ВЕСНІК" СУДЗІЦЦА

ІВАЦЭВІЧЫ. У раённым судзе пад старшынствам суддзі Л. Мішковай пачаўся разгляд спрэчкі, якая ўзнікла паміж жыхаркай вёскі Быцень С. Кулеш і рэдакцыяй газеты "Івацэвіцкі веснік" і яе рэдактарам Р. Радзюком. Пра гэты канфлікт "Газета для вас" пісала ў матэрыяле "Адлуп, або "Івацэвіцкі веснік" судзіцца...". апублікаваным у № 17 за 28.04—5.05. Сутнасць яго такая. Раённая газета апублікавала артыкул "Не будзем агулам абвінавачваць усіх", у якім змешчаны факты, што зневажаюць былога ўрача Быценскай бальніцы Б. П. Кулеша. Ён звольнены з працы па ўласнаму жаданню, а не як п'яніца і прагульшчык, як гэта прыпаднёс сваім чытачам аўтар артыкула Р. Радзюк. Таму, каб абараніць гонар і годнасць мужа, звярнулася ў суд С. П. Кулеш, заадно патрабуючы пакрыцця нанесенага іх сям'і маральнага ўрону.

Сам Б. П. Кулеш на судзе не прысутнічаў. Пасля аўтааварыі, у якую ён трапіў, прыкаваны да ложка. Яго інтарэсы прадстаўляла жонка Святлана Пятроўна. На пасяджэнні выслуханы довады істца, адказчыка і адной сведкі. Суд палічыў магчымым запрасіць у якасці сведкаў яшчэ некалькі службовых асоб, якіх назваў адказчык. Адновіцца пасяджэнне ў пачатку чэрвеня.

Аляксандр ЛАЎРАНЮК.

Заставайцеся з "Газетай для вас"

Паважаныя падпісчыкі і чытачы "Газеты для вас"! Пачалася падпіска на наша выданне на II паўгоддзе 2000 года. У "Газеце для вас" вы заўсёды знойдзеце шматбаковую і разнастайную інфармацыю аб усім, што адбываецца ў нашым рэгіёне, рэспубліцы, свеце, аналітычныя і праблемныя матэрыялы, каментарыі. "Газета для вас" — гэта яшчэ і матэрыялы для дома, для сям'і, для душы, анекдоты, гараскопы, цэны на рынках рэгіёна і многае іншае...

Падпіску на "Газету для вас" вядуць усе аддзяленні сувязі Брэсцкай вобласці. **Падпісная цана на I месяц — 239 руб, на III квартал — 717 рублёў, на паўгоддзе — 1434 рублі.**

А цяпер — увага! Конкурс для работнікаў аддзяленняў сувязі і паштальёнаў!

Паважаныя работнікі сувязі! Мы добра ведаем, якая складаная і нялёгкая ў вас праца. Прапануем яе заахвоціць, а адзяленням сувязі і паштальёнам паспаборнічаць у справе падпіскі на "Газету для вас". Тыя аддзяленні і тыя паштальёны, якія зоймуць прызавыя месцы, значна павялічыўшы колькасць нашых падпісчыкаў на III квартал г. г. у параўнанні з колькасцю падпіскі на II квартал 2000 года, атрымаюць наступныя грашовыя прэміі:

аддзяленні сувязі:

1 месца — 10000 руб.
2 месца — 7000 руб.
3 месца — 4000 руб.

паштальёны:

1 месца — 4 000 руб.
2 месца — 3000 руб.
3 месца — 2000 руб.

Няхай пашанцуе вам і нам!

Рэдакцыя "Газеты для вас".

Умер в скорой

БАРАНОВИЧИ. В машине скорой помощи скончался 6-летний мальчик, житель Барановичского района. Смертельную травму он получил, падая с прицепа трактора во дворе своего дома.

Галина СТРОЦКАЯ.

Столкнулись "Мерс" и "Жигули"

БАРАНОВИЧИ. Это неприятное дорожно-транспортное происшествие произошло еще первого мая. В одном километре от города, на дороге Барановичи-Русино, столкнулись два легковых автомобиля. ДТП произошло из-за того, что водитель "Мерседеса" выехал на полосу встречного движения. Все бы ничего, да спустя неделю водитель "Жигулей" в больнице скончался.

Галина СТРОЦКАЯ.

Адпачынак з трагічным зыходам

БЯРОЗА. Думка "а ці не адправіцца нам на прыроду?" усё часцей прыходзіць у галовы нашых суграмадзян цяпер, калі вясна не ўпускае шанцу пабалаваць нас цеплынёй.

Вось і 23-гадовы Б. — жыхар Белаазёрска — з сябрамі адпачываў на беразе абводнага канала тутэйшай ДРЭС. Маючы магнітафон, яму захацелася павесяліць кампанію. Дзеля гэтага паспрабаваў падключыць апарат да лініі электраперадач. Лёгкадумства абярнулася трагедыяй: маладога мужчыну смяротна траўміравала электрычным токам.

Аналагічнае здарэнне адбылося крыху раней на Чорным возеры. Трое ваеннаслужачых з вайсковай часці, размешчанай у вёсцы Волька Івацэвіцкага раёна, прыехалі сюды парыбачыць. Адзін з іх, кантрактнік, закінуў тэлескапічную вуду, аднак яна зачапілася за правады лініі электраперадач, што праходзіць тут. Маладога рыбака забіла электратокам.

Алесь САШЫН.

ЧАС РЭСПУБЛІКІ

За лішкі плошчы прыйдзецца разлічвацца ўсім

Цяпер і ўласнікам кватэр трэба будзе дакладна вылічваць лішкі плошчы свайго "кутка".

У адпаведнасці з пастановай урада ад 28 красавіка па ўстаноўленых стаўках уносіцца плата за карыстанне (тэхнічнае абслугоўванне) жылога памяшкання з разліку 20 кв. метраў агульнай плошчы на кожнага члена сям'і наймальніка, уласніка, члена арганізацыі грамадзян-забудоўшчыкаў і 10 кв. метраў на ўсю сям'ю. Калі кватэра мае "вагу" больш за гэтыя нарматывы, аплата за лішкі будзе ажыццяўляцца па сабекошту, што зацвярджаецца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам.

Такі парадак, гаворыцца ў пастанове, уведзены ў мэтах устанаўлення роўнай платы за карыстанне (тэхнічнае абслугоўванне) жылых памяшканняў як для наймальнікаў, так і для ўласнікаў кватэр (як вядома, дагэтуль за лішкі плацілі толькі выключна наймальнікі).

("Звязда").

"Бізоны" заменяць "Нівы"

Днямі польска-беларускую мяжу перасеклі 23 збожжаўборачныя камбайны "Бізон", якія ідуць у Мінскую вобласць з Плоцка.

Па словах першага намесніка Мінскага аблвыканкама Уладзіміра Дражына, які сустракаў тэхніку, што ідзе з Польшчы, усяго на Міншчыну будуць адпраўлены 230 новых камбайнаў. Беларусь атрымлівае іх па прадастаўленым ёй тэхнічным крэдыце тэрмінам на тры гады. Тэхніка будзе размяркоўвацца ў залежнасці ад патрэбаў гаспадарак і павінна замяніць стратныя "Нівы".

Распрацаваны праект мемарыяла ў Курапатах

Завершана праца над праектам мемарыяла памяці ахвярам сталінскіх рэпрэсіяў у Беларусі, які плануецца пабудаваць ва ўрочышчы Курапаты ў наваколлі Мінска. Пра гэта паведаміў кіраўнік грамадскага аб'яднання "Хрысціянская злучнасць "Курапаты" Вацлаў Нямковіч.

Як вядома, у 1937-1941 гадах у Курапатах рэпрэсіўныя органы савецкага таталітарнага рэжыму знішчылі дзесяткі тысяч ні ў чым не вінаватых людзей. Паводле слоў В. Нямковіча, на тэрыторыі Курапатаў, якая складае 21 гектар, знаходзіцца 585 месцаў пахаванняў. Больш за сто магілаў былі паварварску знішчаныя ў пасляваенны перыяд; многія з іх зніклі ў сувязі з пракладкай газапровада на цэнтральнай алеі ўрочышча.

Праект мемарыяла прадугледжвае захаванне існуючых месцаў пахаванняў, алеяў і сцяжынак. Над кожнай брацкай магілай прапануецца ўстанавіць памятны знак у выглядзе драўлянага крыжа. Прычым, паводле слоў В. Нямковіча, прадстаўнікі Беларускай праваслаўнай аўтакефальнай царквы прапаноўвалі ўстанавіць шасціканцовы крыж Ефрасінні Полацкай, а вернікі рымска-каталіцкай царквы — чатырохканцовы крыж, падобны таму, на якім быў распяты Ісус Хрыстос. Распрацоўшчыкі праекта прынялі другую прапанову. Мемарыял будзе заключаны ў мастацкую агароджу, а на ўваходзе і выхадзе плануецца пабудаваць дзве аркі. Уздоўж галоўнай алеі будуць устаноўлены памятныя знакі ў гонар кожнага вядомага месца Беларусі, дзе ў гады сталінскіх рэпрэсіяў праводзіліся масавыя знішчэнні людзей, а таксама ў памяць вядомых беларускіх рэлігійных і культурных дзеячаў, закатаваных рэжымам.

На тэрыторыі, што прылягае да мемарыяла, плануецца пабудаваць праваслаўную царкву і каталіцкі касцёл.

Дзень славянскага пісьменства і культуры

Кожны год 24 мая культурная і праваслаўная грамадскасць адзначае Дзень славянскага пісьменства і культуры — свята, усталяванае ў гонар святых, роўнаапостальных Кірыла і Мяфодзія.

Адзінаццаць стагоддзяў таму балгарскія асветнікі, роўнаапостальныя браты Кірыл і Мяфодзій падарылі свету сваю азбуку. З таго часу кірыліца застаецца для нас усё тым жа стваральным пачаткам і разам з хрысціянскімі запаведзямі з'яўляецца галоўным духоўным і культурным багаццем усходніх славян.

Праваслаўная царква шануе святых заступнікаў, усіх, хто займаецца асветніцкай дзейнасцю, а дзень святых, роўнаапостальных Кірыла і Мяфодзія адзначаецца ў славянскіх краінах, як нацыянальнае свята.

(БелаПАН).

ДЗЯРЖАВА І МЫ

Бярозаўскі райвыканкам супраць Беларускага нацыянальнага ўніверсітэта?

У Бярозаўскі райвыканкам ад сяброў рады БНФ г. Бярозы была пададзеная заяўка на правядзенне 14 мая г.г. (прымеркавана да 5-х угодкаў рэферэндуму 1995 г.) пікета ў падтрымку беларускай гістарычнай нацыянальнай сімволікі, надання беларускай мове рэальнага статусу дзяржаўнай мовы, стварэння Беларускага нацыянальнага ўніверсітэта; супраць выніШчэння беларускамоўных класаў у сярэдняй школе; у абарону незалежнасці Рэспублікі Беларусь; за дастойны ўзровень жыцця і своечасовыя выплаты заробкаў.

На пікеце планаваліся правесці збор подпісаў за стварэнне Беларускага нацыянальнага ўніверсітэта (каб забяспечыць грамадзянам Беларусі канстытуцыйныя правы на атрыманне вышэйшай адукацыі па-беларуску) і збор подпісаў супраць спробаў ліквідацыі незалежнасці Беларусі праз стварэнне саюзнай дзяржавы з Расіяй; адкрыццё невялічкай выставы (без продажу) навінак беларускага кнігадруку, незалежнай прэсы, аўдыё- і відэакасетаў на беларускай мове; распаўсюджванне незабароненых інфармацыйных матэрыялаў.

Выканкам дазволіў правядзенне пікету, але змяніў месца: замест ажыўленага цэнтра горада — каля перакрыжавання вуліцаў Леніна і Савецкай — на левы вугал бегавой дарожкі гарадскога стадыёна; і час: замест ад 10.00 да 12 гадзіны на ад 14.00 да 16 гадзіны ("мёртвы час", калі людзей амаль няма ў нядзелю на вуліцах); і ў дадатак "без правядзення збору подпісаў, выставы літаратуры, прэсы, відэа і аўдыёкасетаў, распаўсюджвання інфармацыйных матэрыялаў. Да ўсяго ж з-за нейкіх непаразуменняў паміж намеснікам старшыні райвыканкама Мікалаем Сакалоўскім, што падпісаў распараджэнне, і юрыстам райвыканкама, які рыхтаваў адказ на заяву, дазвол быў атрыманы толькі напярэдадні — у суботу 13 мая (па закону адказ павінны даваць не пазней як за 5 дзён да даты мерапрыемства).

Памятаючы, як 25 сакавіка на пустым стадыёне адзначалі Дзень Волі разам з дзесяткам міліцыянтаў з відэакамерай ды падлеткамі, што з маўклівай згоды міліцыі сталі насупраць пікетоўцаў з плакатам "Смерць БНФ", сябры бярозаўскіх суполак ТБМ, абедзьвух плыняў БНФ і іншых грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партыяў, што збіраліся ладзіць пікет, у такім разе вырашылі адмовіцца ад яго правядзення і шукаць іншыя шляхі данясення сваіх думак і меркаванняў да суграмадзянаў. А фактычную забарону збору подпісаў і распаўсюджвання інфармацыйных матэрыялаў абскардзіць у судзе.

Сяржук РУСЕЦКІ.
г. Бяроза.

СЛУЖБА 01

Агонь усё мацнее

Сухое надвор'е прынесла ў Івацэвіцкі раён мноства пажараў. Пажарныя падраздзяленні выязджаюць на тушэнне рознага роду пажараў і ўзгаранняў па 3—4 разы на дзень. Акрамя пабудоў, якія гараць з-за людской неахайнасці, гараць лясы і тарфянікі. Чырвоныя языкі полымя прайшліся па Гута-Міхалінскім лесе, захапіўшы 14 га. Вялікімі намаганнямі пажарных, работнікаў лясной гаспадаркі, Косаўскага МВА і іншых вытворчых прадпрыемстваў яго ўдалося патушыць.

Ад маленькай, нябачнай іскрынкі загараюцца тарфянікі. Застаецца непатушаным толькі тарфянік на землях калгаса "40 год Кастрычніка" на мяжы Баранавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў. Гарэлі-дыміліся тарфянікі каля вёскі Аброва калгаса імя Чапаева, каля в. Заполле калгаса "Косава", на землях калгаса "Іскра", саўгаса "Перамога". Яго патушаны тарфянікі на плошчах Дзяржлесфонду Івацэвіцкага і Баранавіцкага лясгасаў.

Сіноптыкі пакуль не прагназуюць ападкаў. Івацэвіцкі райвыканкам сваім распараджэннем забараніў уезд транспарту ў лясы і абмежаваў работу транспарту на тарфяных масівах.

Валерый МОЛАШ,
старшы супрацоўнік ЦНПБ ПАВА Івацэвіцкага раёна.

АЛЁ, РЭДАКЦЫЯ?

Нясіце ваша золата ў магазін "Сапфір"

— "Газета для вас"? Добры дзень! Часта чытаю ў вашым выданні аб самых розных паслугах, але вось ніводнага разу не чытала пра тое, дзе можна рэалізаваць залатыя вырабы.

Хачу здаць залаты ланцужок. Золата — два грамы, проба — 583. Яшчэ, дарэчы, савецкага вырабу. Куды звярнуцца?

Н. ГЕГЕНЯ, Івацэвіцкі раён.

На пытанне нашага чытача адказвае загадчыца секцыі магазіна "Сапфір" (г. Баранавічы) Ніна Іосіфаўна ЯРАШЭВІЧ:

— На сённяшні дзень наш магазін скупляе залатыя вырабы (найбольш масавыя пробы) па наступных цэнах:

583, 585 пробы — 4378 рублёў за грам,

750 проба — 5612 рублёў за грам,

зубапратэзнае золата — 6623 рублі за грам.

Акрамя гэтага ў нашым "Сапфіры" існуе камісійны аддзел па прыёму залатых вырабаў пад далейшую рэалізацыю. У такім выпадку грошы вам выплацяць не адразу, а пасля рэалізацыі.

Але кошт для вас вырабу ўжо будзе вышэйшым на 100—120 працэнтаў.

Ваша чытачка, як я зразумела, робіць акцэнт на тым, што выраб і золата яшчэ савецкага часу. Гэта гонар яе асабістых фантазій.

На самой справе, золата не мае нацыянальнасці, і савецкае не лепшае, не горшае, чым турэцкае ці польскае. Золата можа быць золатам або не быць ім. І ўсё тут. **Наш магазін знаходзіцца ў г. Баранавічы па вуліца Леніна, 15. Тэлефон — 2-36-22.**

КРЫМІНАЛ

Вор знает, куда ему идти

БАРАНОВИЧИ. Не проходит и дня, чтобы в гор- или райотделах милиции не регистрировались факты краж. Крадут всё: от кур с петухами до приличных сумм денег. Ну как не соблазниться и не залезть в квартиру, если знаешь, что там покоятся 2.800 долларов и 900 дойчмарок!

Неработающему жителю нашего города понадобились холодильник, постельное белье и столовый сервиз. Вынести-то вынес из квартиры по ул. 50 лет ВЛКСМ, но попользоваться не довелось — попался.

Но больше всех не повезло рабочему автоагрегатного завода. Приходит он в гардероб, а там ни его куртки, ни брюк, ни рубашки...

Если у вас есть 80 миллионов неденоминированных рублей, не возите их в полиэтиленовом пакете в автобусе — украдут. Именно такое ЧП случилось недавно в городском автобусе.

Галина СТРОЦКАЯ.

Нашли гашиш

БАРАНОВИЧИ. При проведении оперативно-розыскных мероприятий в одной из квартир, расположенных на улице Коммунистической г. Барановичи, были найдены 400 граммов маковой соломки и 100 граммов, предположительно, гашиша. Благо, ни сбыть, ни выкурить не удастся.

Да и по закону перед судом отвечать придется.

Алина ПЕТРОВА.

РЫНКАВАЯ ПЛОШЧА

ШТО ПАЧЫМ?

Цэны на рынках нашага рэгіёна па стану на 17.05.2000 г. (у руб. за адзін кілаграм):

	Івацэвічы	Баранавічы	Бяроза	Пружаны
Свініна	1200—3000	1500—3000	1200—3000	1300—3000
Сала салёнае	1500	1500	1200	1300
Алей (1 л)	630—850	600—900	550—750	660—750
Яйкі	400—450	350—450	400—450	400—460
Малако (3 л)	270—300	300	270—300	270
Тварог	300	350—400	400—500	360
Масла сметанк.	1500	1800	1500	1500
Цыбуля зялён.	600	200—250	500	600
Радыс (1 пучок)	80—100	140	80	80-100
Бульба	—	120	100—120	95—100
Морква	200	200—250	170—200	190
Агуркі свеж.	600	650—750	700	600—700
Яблыкі	350—480	360—750	380—480	400—550
Памідоры	1600	1300	1500	1600
Вінаград	2500	2100	2200	2500
Грэцкія арэхі	950	850—950	850—950	900
Часнок	1000	1100	1100	1000
Лімоны	1000	900—950	990	1000
Апельсіны	650—700	750—820	790	700
Бананы	750—820	650—750	790	700—800
Мандарыны	1000	900	900—1000	1000
Грэчка	630—650	600	650	650—660
Макар. вырабы	300—430	300—400	280—320	270—300
Рыс	420—450	420	400—430	470—500
Манныя крупы	360	350	350	360
Проса	240	300	230	300
Цукар	270	280	290	270
Мёд	2.800	3.000	3.000	2.800

ВАЛЮТА НА "ЧОРНЫМ" РЫНКУ (руб.)

	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж
1 долар ЗША	970	990	960	990	960	990	960	990
1 дойчмарка	485	495	480	495	480	495	480	495
1 рубель Расіі	32	33	32	33	32	33	32	33

● АЛЁ, РЭДАКЦЫЯ?

ОСОБОГО ПОЛОЖЕНИЯ У НАС НЕТ. НО И ГОРЯЧЕЙ ВОДЫ — ТОЖЕ

— "Газета для вас"? Обратите внимание на проблему горячего водоснабжения в г. Ивацевичи. 11 мая на многоквартирных домах нашего Северного микрорайона **(в других микрорайонах тоже — ред.)** *появилось объявление следующего содержания:*

Администрация ЖКХ уведомляет жителей, что в связи с ремонтом теплосетей и сетей горячего водоснабжения горячая вода подаваться не будет до особого распоряжения Ивацевичского райисполкома.

Администрация РПО ЖКХ.

Прочитал я это объявление и пошел в квартальную котельную, благо она рядом — на ул. Шевченко. Спрашиваю у работников, что за ремонт у вас такой, что горячей воды не будет. Пожимают плечами, говорят, у нас все исправно. Звоню в газету "Івацэвіцкі веснік" и прошу объяснить, что за необходимость ждать воду, чтобы помыться, до особого распоряжения райисполкома. Отвечают : а что мы можем объяснить, не мы ж писали эти объявления и распоряжения...

Вот я, как и все жители многоквартирных домов, думаю, когда же нам позволят помыться? **Почему для этого позволения нужно особое распоряжение райисполкома!** *Что, у нас в городе введено особое положение? Но оно, в соответствии с Конституцией, вводится в чрезвычайной или военной ситуации...*

И еще. Если в РПО ЖКХ нет средств для подачи горячей воды населению, то лично я готов платить за эту услугу в 2—3 раза больше, но ходить чистым. Думаю, что и большинство жителей многоквартирных домов также поступят.

Георгий Степанович СЕРЫЙ, житель Северного микрорайона г. Ивацевичи.

ОТ РЕДАКЦИИ. Скажем сразу, что звонков такого же содержания нам было много. И мы попробовали выяснить как причину появления этого необычного объявления, так и сроки, когда горячая вода все же будет подаваться в многоквартирные дома.

Звоним в РПО ЖКХ. Работник диспетчерской службы зачитывает нам распоряжение Ивацевичского райисполкома №122-р от 10.05.2000 г. "О прекращении подачи горячей воды": **В связи с производством ремонтных работ на теплосетях и сетях горячего водоснабжения и отсутствием средств на погашение задолженности и оплаты текущего потребления топливно-энергетических ресурсов с 10.05.2000 г. прекратить подачу горячей воды на всех котельных, кроме больниц, ПТУ-162 и санатория "Сосновый бор" до особого распоряжения.**

Звоним председателю Ивацевичского райисполкома В. В. Летяго, объясняем суть нашего обращения именно к нему. Владимир Васильевич отвечает примерно так:

— Вчера вечером я увидел объявление РПО ЖКХ на дверях подъезда многоквартирного дома, где живу, и также был немало удивлен словами "до особого распоряжения". Как вы понимаете, лично я распоряжения не пишу и объявления не развешиваю. Есть люди, в служебные обязанности которых это входит. Вот они и оказали райисполкому медвежью услугу и напугали город одним-единственным словом. **Никакого особого положения ни в районе, ни в городе Ивацевичи никто не вводил.**

Что касается непосредственно подачи горячей воды, то руководство РПО ЖКХ докладывало о необходимости ремонта и чистки всей системы подачи воды и согласовывало с райисполкомом сроки начала этого ремонта. Не секрет же, что этот ремонт необходим, потому что как людям нужна горячая вода, так же нужно, чтобы она была чистой — не рыжей и не с песком. Сколь долго продлятся ремонтные работы сказать не могу — это дело специалистов.

XXX

Подведем итоги: особое положение в г. Ивацевичи не вводилось. Но, тем не менее, воды горячей не будет до... Может и до осени. Почему? Как мы поняли: нет средств в районном бюджете на "оплату текущего потребления топливно-энергетических ресурсов". А когда бюджет пуст, то тут уже не до помывки всех и каждого... Тут бы только хотя бы одну шею уберечь, чтобы не намылили...

● КОНКУРС

"САМАЯ ОБАЯТЕЛЬНАЯ И ПРИВЛЕКАТЕЛЬНАЯ"



НАТАЛЬЯ. По гороскопу — Телец.

Основное время отдаю учебе в колледже. Люблю хорошую музыку: как отечественную, так и зарубежную. Кумиров нет.

Нравятся высокие, стройные парни. Сужу о них по внешнему виду и состоянии обуви.

● ВЫБАРЫ

Ці прыбудуць міжнародныя назіральнікі на парламенцкія выбары ў Беларусь?

Міжнародныя назіральнікі прыбудуць у Беларусь на парламенцкія выбары гэтай восенню толькі ў тым выпадку, калі беларускія ўлады выканаюць шэраг патрабаванняў у чатырох асноўных сферах — удасканальванне Выбарчага кодэкса, доступ апазіцыйных партый да дзяржаўных СМІ, перш за ўсё да тэлебачання і радыё, пашырэнне паўнамоцтваў парламента і паляпшэнне сітуацыі з правамі чалавека. Пра гэта заявіў Вальтэр Зігль, дырэктар па палітычных пытаннях АБСЕ, на прэс-канферэнцыі, што была прысвечана вынікам візіту прадстаўнікоў "тройкі" АБСЕ ў Мінск. Паводле слоў сп. Зігля, усе патрабаванні грунтуюцца на агульнапрынятых дэмакратычных нормах і на дакументах АБСЕ, у тым ліку на дэкларацыі саміту АБСЕ ў Стамбуле, дзе было запісана, што ў Беларусі існуе канстытуцыйны крызіс.

Адной з асноўных прапаноў па ўдасканаленні выбарчага заканадаўства сп. Зігль назваў неабходнасць паўнавартаснага ўдзелу прадстаўнікоў апазіцыйных партый у працы ЦВК.

Прадстаўнік АБСЕ выказаў расчараванне тым, што тыя пагадненні аб доступе апазіцыі да дзяржаўных СМІ, якія былі падпісаны прадстаўнікамі ўлад летась, дагэтуль не ажыццяўляюцца.

Сярод асноўных праблем у сферы правоў чалавека сп. Зігль назваў судовыя працэсы, якія, на думку АБСЕ, маюць палітычную афарбоўку — справы былога прэм'ер-міністра Міхаіла Чыгіра, дэпутата Вярхоўнага Савета 13-га склікання Андрэя Клімава, лідэра Сацыял-дэмакратычнай партыі Мікалая Статкевіча ды іншых. Прадстаўнікі АБСЕ заклікалі ўлады, каб усе гэтыя справы былі вырашаны ў адпаведнасці з прынцыпам верхавенства закону.

Нарэшце, неабходна пашырыць паўнамоцтвы парламента, абмяжаваўшы заканадаўчыя паўнамоцтвы прэзідэнта , каб парламент зрабіўся паўнавартасным заканадаўчым органам, лічаць прадстаўнікі АБСЕ.

У размове з карэспандэнтам БелаПАН, кіраўнік Кансультатыўна-назіральнай групы АБСЕ ў Беларусі Ханс-Георг Вік заявіў, што сярэдзіна ліпеня будзе апошнім тэрмінам для канкрэтных крокаў беларускіх улад у тых сферах, якія былі вызначаны АБСЕ . Ужо ў жніўні міжнародныя арганізацыі, у тым ліку і АБСЕ, пасля кансультацый прымуць канчатковае рашэнне, ці дасылаць сваіх назіральнікаў на парламенцкія выбары ў Беларусь, сказаў сп. Вік. Адсутнасць назіральнікаў АБСЕ на выбарах значыла б, што гэтая арганізацыя лічыць свабодныя і справядлівыя выбары ў нашай краіне немагчымымі ў сённяшніх умовах.

Аляксей ЗНАТКЕВІЧ. БелаПАН.

● ЭКОНОМИКА

Новая программа правительства: старая песня о главном

12 мая Палата представителей Национального собрания Беларуси одобрила программу действий правительства, которую представил в соответствии со статьей 106 Конституции глава Совета Министров Владимир Ермошин.

Предложенный вниманию парламентариев документ представляет собой симбиоз нескольких комплексных программ развития страны. Он впитал в себя тезисы из Национальной стратегии устойчивого развития Республики Беларусь, Концепции социально-экономического развития Республики Беларусь до 2015 года, Основных направлений социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2010 года, программы социально-экономического развития страны на 2000 год и, конечно, из недавнего послания президента Национальному собранию.

Исходя из определенных в этих документах приоритетов, правительство выбрало в качестве стратегических задач на ближайшие пять лет наращивание экспорта товаров и услуг; развитие агропромышленного комплекса; активизацию инвестиционной и инновационной деятельности; рост жилищного строительства; формирование эффективной системы здравоохранения.

Однако изменяются методы достижения поставленных целей и задач. В своем вступлении в парламенте премьер отметил, что со второй половины 1998 года закончился провальный период белорусской экономики, для которого были характерны необоснованные эмиссионные вливания в экономику. Поднимать народное хозяйство, как следует из документа, правительство начнет с оздоровления финансовой системы, перехода к единому обменному курсу, постепенной либерализации валютного регулирования, восстановления валютных резервов страны и создания стабилизационного фонда. Одновременно с этим пройдет реформирование налоговой системы. Правда, для перехода к единому курсу у правительства и Нацбанка пока нет необходимых золотовалютных запасов, а единственное, чего удалось добиться правительству за 4 месяца 2000 года, - это сократить разрыв между официальными и неофициальными курсами с трех до двух раз.

В реальном секторе экономики правительство ставит задачу создать необходимые макроэкономические условия для развития производства. Для этого избирается все тот же стандартный набор мер: финансовое оздоровление экономики; осуществление структурной перестройки; реализация мер по преодолению безработицы; инвестирование экономики, новая амортизационная политика, концентрация ресурсов на приоритетных направлениях, формирование межгосударственных и межрегиональных финансово-промышленных групп в рамках российско-белорусского союза, СНГ и других межгосударственных интеграционных образований.

Перед агропромышленным комплексом ставится задача не только обеспечить продовольствием внутренний рынок, но и создать экспортный фонд в размере 15-20 процентов валового производства. А главной стратегической задачей АПК объявлено преодоление зерновой зависимости Беларуси. Со своей стороны правительство гарантирует АПК финансовую поддержку. Причем основную часть этой помощи - до 70 процентов - планируется направлять на дотации к закупочным ценам на продаваемую государству продукцию и лизинг сельскохозяйственной техники.

Правительство также намерено совершенствовать и кредитную политику в сфере аграрного производства. Так, например, согласно документу, получить кредитную поддержку в 2001 году смогут только те сельхозпредприятия, которые рассчитаются с заготовителями и банками после уборки урожая 2000 года. Однако если учесть, что половина сельхозпредприятий ныне убыточны и долги их нарастают как снежный ком, то может статься, что обещанные кредиты в 2001 году выдавать будет уже некому.

Ориентиры во внешнеторговой деятельности определены в программе также вполне традиционные. На первом месте - взаимоотношения со странами СНГ и Россией.

В развитии интеграционных связей с дальним зарубежьем приоритет отдается сотрудничеству с государствами Центральной и Восточной Европы, а также странами Балтии и Польшей. Сказано в программе и о расширении торгово-экономических связей со странами Европейского союза и США.

В социальной сфере правительство намерено стабилизировать демографическую ситуацию, повысить уровень доходов населения, реформировать систему пенсионного обеспечения, завершить реализацию чернобыльской программы, а также сохранить и развить государственную систему образования.

Реализация всех задуманных мероприятий, по замыслам правительства, позволит увеличить с 2000 по 2005 годы ВВП страны в 1,24-1,33 раза, объем продукции промышленности - в 1,24-1,28 раза, сельского хозяйства - в 1,2-1,3 раза. Производительность труда и реальная заработная плата за этот же период должны возрасти в 1,3-1,4 раза.

В общем - ничего нового, ничего революционного. Беларусь по-прежнему верна изобретенной А.Лукашенко модели социально-экономического развития, определенной как социально ориентированная рыночная экономика. Только на смену старому исполнителю пришел более молодой, более напористый. Пришел, чтобы попытаться выполнить не им принятые государственные программы.

Понимание того, что надо бы делать, есть. Однако вместе с тем ясно, что при существующей системе государственного управления от правительства мало что зависит. Экономика Беларуси подчиняется политическим прихотям одного человека, который в одночасье может перечеркнуть все благие начинания правительства.

Юрий ПОТЁМКИН. БелаПАН.



● ЭНТУЗИАСТЫ

ПРОБЛЕМУ ВАШУ РАЗРЕШУ...

В наше время семья стала объектом пристального внимания социологов, демографов, психологов, медиков... Именно в ней происходят сложные и неоднозначные перемены, причины и сущность которых исследователи объясняют по-разному. Одно не вызывает сомнений: проблемы в семье возникают не только в материальной сфере, но и в морали, этике, психологии. Всё это отклик на те проблемы, с которыми сталкиваются люди сегодня.

В этой связи создание развитой сети социально-психологической службы просто необходимо. Слово психолог вошло в нашу жизнь давно и прочно. Психея — это богиня души, значит и психология — наука о душе. О душе большого и маленького человека, у которого проблем в жизни не меньше, чем у взрослых. Поэтому каждый, кто приходит работать психологом, делает это с наилучшими намерениями.

...Эту молодую светловолосую женщину знают в г. Береза многие. Взрослые встречаются с ней на родительских собраниях, а дети приходят сами со своими проблемами. Она всегда внимательна, добра, корректна.

Знакомьтесь: Наталья Николаевна Мшар. Профессиональный психолог. Закончила Московский психолого-социологический институт. Работала психологом в средней школе № 1 г. Березы, теперь — в начальной школе. Замужем. Растит дочь Машеньку. Любит свою семью и свой дом. Очень много друзей у Натальи Николаевны. Почему? Наверное, умение общаться с людьми, умение слушать, сопереживать, помогать и притягивает к ней людей.

Я познакомилась с Натальей Николаевной Мшар недавно, но с первой же встречи осталось чувство, будто всегда знали друг друга.

Трудно ли быть психологом? Что это за профессия? Что должен уметь психолог? Эти вопросы я и задала своей знакомой.

— Трудно, особенно сейчас, — сказала Наталья Николаевна. — Ведь проблем в нашей жизни не убавляется. Их ощущают в первую очередь дети. И все же эта работа мне нравится. Нравится общаться с ребятами, помогать им найти выход из сложной ситуации. Ну, а чтобы быть хорошим психологом, нужно быть философом и ребенком в одном лице, любить детей и понимать их родителей. Нужно хорошо ориентироваться в характере ребенка, уметь отличать избалованность от несформированности, владеть методами игровой групповой терапии. Все это требует от психолога постоянного пополнения знаний. Однако даже опытный специалист не может знать все, поэтому сложные ситуации возникают довольно часто...

Как и любая другая профессия, профессия психолога имеет свои трудности и проблемы. Как подчеркнула Наталья Николаевна, непросто складывается жизнь психолога в педагогическом коллективе, как тяжело во всем зависеть от администрации.

С какими же вопросами обращаются к психологу чаще всего дети? Это страх в отношениях с учителями, неумение общаться со взрослыми, непонимание родителей и т. д. Были случаи, когда приходили ребята, уставшие от неразрешимости проблем, готовые расстаться с жизнью, как единственным решением неразрешимых вопросов. С ними, конечно, было тяжелее всего. Ведь нельзя было ошибиться ни в чем, чтобы не случилась беда.

Мне почему-то захотелось сравнить работу психолога со спортивным тренером, который помогает развивать нужную группу мышц, мускулов. Но качать-то мускулы спортсмену приходиться самостоятельно.

И еще об одной стороне деятельности Натальи Николаевны. Разговор пойдет о телефонной помощи нашим жителям.

Телефонная помощь для людей в кризисе или решивших расстаться с жизнью возникла более 40 лет назад. Местом её рождения стал Лондон. Идея эта оказалась столь привлекательной, что службы телефонной помощи возникли в большинстве европейских столиц или крупных городах. Совсем недавно пришла телефонная помощь и в жизнь подростков г. Березы. Одним из сотрудников психологической службы помощи является и Наталья Николаевна Мшар.

С какими же вопросами обращаются подростки по телефону?

— Психологическая служба помощи "Подросток", — рассказывает Наталья Николаевна, — постепенно входит в жизнь города. Если вначале это были одиночные звонки, то теперь звонят гораздо чаще. Служба работает анонимно, но часто по голосу звонящего я определяю, как нужно разговаривать или вообще нужно просто помолчать, выслушивая подростка. А вообще, по телефону давать советы очень сложно — не видишь лица, глаз человека, можешь только представлять его. Нельзя ни в чем ошибиться. Кстати, меньше всего звонков по субботам. Думаю, потому что родители дома...

"У нас есть два уха и один рот, — сказал Сократ, — что означает, что мы должны больше слушать и меньше говорить". Эти слова в полной мере можно отнести к любому психологу, в том числе и к моей знакомой.

Какие же планы Натальи Николаевны на будущее, о чем она мечтает? Заветной мечтой психолога является создание в городе психолого-социологического центра для детей и взрослых, чтобы любой человек мог придти и решить свои проблемы, получить любую психологическую помощь. Эту свою мечту Наталья Николаевна пока пытается осуществить на базе начальной школы вместе с директором И. М. Ракицкой, пробуя создать кабинет психологической разгрузки. И для детей, и для учителей это будет много значить.

И все же вывод напрашивается сам по себе: ни школа, ни психолог, ни друзья, как бы широк не был их круг, не в состоянии дать человеку того, что может дать семья. А психолог — это помощник в большом деле воспитания молодого поколения, каким и является Наталья Николаевна Мшар.

Ирина МИНЕЕВА.
г. Береза.

● ГОЛАС НАРОДА

Ці памятаеце вы сваю першую настаўніцу?

Бясспрэчна тое, што сэнс слоў — першы настаўнік (настаўніца) — адзін з самых сімвалічных і значных. Бо пры ўсёй значнасці і важнасці фігуры і ролі настаўніка ў савецкай і постсавецкай прасторы, менавіта першы настаўнік для большасці з нас — фігура, так бы мовіць, знакавая.

У якой ступені з'яўляецца гэта бясспрэчным, ці не змяніліся ў новыя часы адносіны да чалавека, які першым уводзіць дзіця ў свет ведаў, каб вучыць добраму, разумнаму, вечнаму? Вось якія адказы на пытанне, змешчанае ў загалоўку, мы пачулі на вуліцах г. Івацэвічы.



Наташа: Канешне, памятаю. Папершае, таму, што я сёння сама настаўніца, па-другое, таму, што больш ніколі не сустракала такой шчырасці і павагі да дзіцяці, як у першай сваёй настаўніцы. Дарэчы, я пачынала сваё жыццё і вучобу ў Зеляневіцкай СШ (Пружанскі раён), маю першую настаўніцу звалі Ганна Аляксандраўна. Яна была не толькі першая, а самая лепшая за ўсіх, каго я потым сустракала ў навучальных установах.

Валерый Яўгеневіч: Памятаю, нават зараз скажу як яе імя, прозвішча, імя па бацьку — Зінаіда ...Міхайлаўна (задумаўся) Крыцкая. Так-так, Крыцкая — прозвішча яе! Сярод маіх настаўнікаў было шмат цікавых, цудоўных людзей, але да першай — асаблівая пяшчота. Яна шмат чаму добраму нас навучыла.



Наташа: Так, канешне, памятаю, хоць у мяне былі дзве першыя настаўніцы — Любоў Цімафееўна і Ніна Іванаўна. Хоць быў у іх розны падыход да навучальнага працэсу, былі яны рознымі людзьмі, але з душой адносіліся да сваёй работы, да нас, дзяцей. Дзеці заўсёды гэта добра адчуваюць і цягнуцца да шчырых людзей.

Сцяпан Аляксандравіч: Чаму ж не памятаю? Добра памятаю. Прозвішча яе — Патапава, звалі — Ганна... А як па бацьку? Цяжка ўспомніць.

Тады я хадзіў у вясковую школу, адукацыю атрымаў — чатыры класы. І толькі адна настаўніца працавала тады з намі. Час быў такі...

У народ хадзілі Аляксандр ГОРБАЧ, Аляксей ГАНЧУК (фота).

● НАША ІНТЭРВ'Ю

Быць самім сабою

У школах заканчваецца яшчэ адзін навучальны год. Пасля здачы дзяржаўных экзаменаў тысячы юнакоў і дзяўчат пойдуць шукаць свае дарогі ў нялёгкім жыцці. Хто ён, сённяшні выпускнік, з якімі думкамі ўступае ў самастойнае жыццё? На гэтую тэму наш карэспандэнт вядзе гутарку з вучнямі 11 "Б" класа сярэдняй школы № 4 г. Пружаны Мікалаем КАЗАКОМ і Анастасіяй ЗІНЕВІЧ.





— Вось і праляцелі школьныя гады. Калі ўвесь гэты час вы былі, так бы мовіць, пад наглядам бацькоў і педагогаў, то напярэдзе чакае нязведаная самастойнасць. Ці прадчуваеце трывогу за сваю будучыню, альбо наадварот, з аптымізмам глядзіце на жыццёвыя рэчы?

Коля: Шчыра кажучы, цяпер ужо не хочацца развітвацца са школьнай партай, таму што акрамя вучобы больш нічога асабліва не турбавала. Цяпер трэба думаць, куды падацца далей. Мы ўсе аптымісты, таму імкнемся дасягнуць пастаўленай мэты.

Насця: Усё жыццё сядзець на чыёйсці шыі не будзеш. Трэба самому вырашаць свой лёс, змагацца за сваё месца пад сонцам. Канечне, трывога ёсць.

— Вы, зразумела, ужо вызначыліся кім быць, куды паступаць вучыцца далей?

Насця: Мару стаць юрыстам, таму хачу паступіць у Гродзенскі ўніверсітэт.

Коля: Мяне чамусьці вабіць тэхніка. Люблю трактары і машыны. Хочацца вучыцца ў Мінскай політэхнічнай акадэміі. Калі не паступлю, уладкуюся дзе-небудзь на работу, каб зарабляць грошы і ні на каго не разлічваць.

— У цяперашні час паступіць у вышэйшую навучальную ўстанову намнога складаней, чым гадоў дваццаць назад. Многія з іх платныя, у іншыя не паступіш, не маючы блату. Я ведаю шмат прыкладаў, калі ў ВНУ вучацца зусім выпадковыя студэнты, вучацца дзеля дыплома і дзякуючы багатаму татку ці мамцы пры высокай пасадзе. Вам жа давядзецца, мяркую, разлічваць на атрыманыя ў школе веды, бо вы, як мне падказвае журналісцкі вопыт, не з выпеставаных сем'яў!

Коля: Мае бацькі — рабочыя. Таму разлічваю толькі на сябе. А вучыцца хачу не дзеля дыплома, а рабіць карысць для грамадства, для дзяржавы.

Насця: Жыву з родным братам. Так сталася, што выхоўваюся без бацькоў.

— Прабач, Насця... Табе ўжо давялося многае паспытаць. Хачу пацікавіцца вашымі думкамі наконт сучаснай моладзі. Хто яны, вашы равеснікі? Ці здольны яны дапамагаць старэйшым пакаленням вырашаць дзяржаўныя задачы!

Коля: Такіх вельмі мала. Цікавая рэч — чым багацейшы наш чалавек матэрыяльна, тым бяднейшы духоўна. Разбэшчанасць, нявыхаванасць падлеткаў усё прыкметней назіраецца на вуліцы. Іншы раз вечарам нават страшнавата выйсці ў горад.

Насця: Розныя плыні, розныя прычоскі. Лысыя і касматыя... Гэта было, мусіць, ва ўсе часы. Аднак я супраць усяляких куміраў. Чалавек павінен сам сябе будаваць. А мы ўсё чамусьці хочам быць падобнымі на некага. Гэтаму спрыяе замежная музыка, крывавыя баявікі, якімі забруджаны экраны тэлевізараў.

— Вы, можа, не задумваліся над тым, што за юначыя душы ідзе скрытная барацьба. Хаця на першы погляд школа не займаецца палітыкай, але жыць у вакууме немагчыма. Прыклад таму стварэнне такой грамадскай арганізацыі як БПСМ. Згодна з нашымі законамі такія арганізацыі не павінны фінансавацца дзяржавай, аднак вышэйзгаданую падтрымлівае матэрыяльна прэзідэнт краіны. З другога боку, у студэнцкім асяроддзі, асабліва ў сталіцы, існуе шмат маладзёжных арганізацый апазіцыйнага накірунку ў адносінах да кіраўніцтва рэспублікі. Вашы адносіны да палітыкі? Спадзяюся, што маё пытанне і вашы адказы не паўплываюць адмоўна на экзаменацыйныя адзнакі.

Насця: Асабіста мяне ніякія рухі і партыі не цікавяць. А наконт грамадзянскай пазіцыі адзначу, што ў рэфармаванні краіны зроблена і робіцца шмат памылак. Іх трэба тэрмінова выпраўляць. Якім чынам? Тут многае залежыць ад нас, маладых.

Коля: Трэба быць самім сабой. Калі палітыка робіцца за грошы, то я супраць такой палітыкі.

— Падводзячы вынік нашай гутаркі, варта сказаць, што вы не дарма прасядзелі за школьнай партай адзінаццаць гадоў і атрымалі веды згодна праграмы, удзячны педагогам. Жадаю вам выдатных адзнак на экзаменах, здзяйснення мар, разумных настаўнікаў у жыцці.

Гутарыў Аляксей ГАНЧУК.
Фота аўтара.
г. Пружаны.

АФГАНИСТАН: ПЕРВАЯ ПРОБА НАРКОТИКА

Для большинства из нас война в Афганистане так и осталась загадочной историей умершего государства и почивших в бозе организаторов сей войны.

Но живы молодые люди, прошедшие через её горнило. Рассказывая о ней, кстати, мало кто из них употребляет бессмысленный и пустой штамп — интернациональный долг, которым на десятки лет вперед набили оскомину народу коммунистические холуи. Есть просто правда жизни, которая интересная тем людям, кто простоту, если хотите, наготу бытия предпочитает выдуманным идейными батраками сказкам.

Предлагаю сегодня читателю рассказ воина-интернационалиста Юрия Р., живущего сегодня в одной из деревень Ивацевичского района. Рассказ необычный, если вспомнить "лирику" иных афганских воспоминаний, но которому не доверять, считаю, нет никаких оснований.

В 1983 году мне исполнилось 18 лет, и я был одним из многих тех ребят, которым предстояло идти служить и перед кем замаячил призрак Афганистана. В районной автошколе, где мы, одноклассники, учились целой компанией, открыл категорию "В" и "С", водил КамАЗ. Всей компанией нас в Афганистан и отправили.

Армия, сами понимаете, жизнь в свободной импровизации. Перед призывом все стращают тебя рассказами о дедовщине, строевой службе, подъемах за 45 секунд и отбоях, сапогах и портянках и т. п. Но никто не говорил, а в те времена тем более, о наркомании , которая, как оказалось, надёжно "прописалась" в ограниченном контингенте. Поэтому поверьте, об этом многие из бывших там знатет не понаслышке, значительная часть "афганцев" баловались самыми разными наркотическими "снадобьями". Тем более, такие как мы, водители КамАЗов, которым предстояло за два года исколесить весь Афганистан.

Вспоминаю свой первый день на этой опалённой, неспокойной афганской земле. Я, волнуясь, оглядываю свой новый КамАЗ, а из стоящего неподалёку тоже КамАЗа выглядывает загорелый, как кирпич, старослужащий, машет мне рукой: "Салага! Метнись сюда скорей!" Я подбегаю, открываю дверцу машины: "дед" держит в руке шприц, оголив руку. "Подержи здесь, — раздраженно говорит он, — одному мне не уколоться. Надо чтобы кто-то придерживал, а то "ханка" назад брызнет".

Придерживаю, помогаю, ошеломленный увиденным. Через полминуты вижу как расширяются зрачки его глаз, он весь обмяк, в лице — блажь и удовольствие. Он хлопает меня по плечу, хохочет, с такой задушевностью мне что-то рассказывает, как будто мы с ним знакомы сто лет. Мне же всё это в диковинку: сельский парень, в свои 18 лет я не то, чтобы мало знал, я вообще впервые слышал и видел, что они в природе существуют — наркотики.

